# «МНЕ ПАДАБАЕЦЦА ДАПАМАГАЦЬ ЛЮДЗЯМ...»

## Малады спецыяліст пра першае працоўнае месца, цікавасць да прафесіі і тое, што агульнага паміж медыцынай і музыкай

**Жыццё Аліны Андрушынай нядаўна кардынальна памянялася. Учарашняя студэнтка Віцебскага медыцынскага універсітэта з 1 жніўня займае пасаду ўрача-неўролага Быхаўскай ЦРБ. Наперадзе — два гады адпрацоўкі, і гэта вельмі добрая школа для атрымання вопыту для маладога спецыяліста.**



Аліна — дзяўчына сур'ёзная і мэтанакіраваная. З прафесіяй вызначылася яшчэ ў школе. Медыкаў у яе сям'і няма, але ёй вельмі падабаліся хімія і біялогія. Калі атрымала атэстат, яшчэ вагалася паміж біяфакам БДУ і медыцынскім ВНУ. Але, калі ўсё ўзважыла і абдумала, вырашыла, што выкладчыцай быць добра, але ўсё ж такі ўрачом лепш. Падчас вучобы былі моманты, калі прыходзілі думкі: «А што, калі памылілася з выбарам?» Прафесія не для слабанервовых, трэба быць рашучым, адказным і ўмець трымаць сябе ў руках. Выгляд крыві яе не пужаў, але калі па вучобе прысутнічала на ўскрыцці, было крыху не па сабе. Потым супакоілася: не паталагаанатамам жа збіраецца працаваць, а значыць, і перажываць не трэба. На апошнім курсе канчаткова вызначылася з будучым профілем — неўралогія. Быхаў выбрала асэнсавана: ад яго зусім блізка да роднага Магілёва. А ў Магілёве — бацькі, малодшая сястра, сябры, трэнажорная зала, нарэшце, куды Аліна ходзіць, каб трымаць тонус.

— Мне цікава пачынаць сваю працоўную дзейнасць менавіта ў Быхаўскай раённай бальніцы, — кажа яна. — Праз яе прайшло шмат вядомых магілёўскіх медыкаў, якія займаюць сёння кіруючыя пасады. Некаторых з іх я ведаю асабіста і хачу стаць такім жа прафесіяналам, як і яны. Разумею, што для гэтага трэба пастаянна вучыцца, таму шмат вольнага часу аддаю вывучэнню спецыяльнай літаратуры.

Падчас праходжання інтэрнатуры ў Магілёўскай гарадской бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі паспела захапіцца складанымі медыцынскімі выпадкамі.

— Гэта чараўніцтва, калі на вачах чалавек, які літаральна паміраў, вяртаецца да жыцця, — кажа Аліна. — Медыкі прымяняюць у сваёй рабоце передавыя прыёмы лячэння. Той жа тромбалізіс, які дапамагае пацыенту хутка акрыяць ад інсульту і стаць на ногі. Шмат чаго для сябе адкрыла, шмат чаму навучылася ў магілёўскіх урачоў. Яны вельмі дасведчаныя. Нават не магу кагосьці аднаго выдзеліць — усе цудоўныя. Дзякуючы ім, мне спадабалася аказваць экстранную дапамогу, працаваць са складанымі пацыентамі. Уразіла, якая сучасная і тэхналагічная ў Магілёве бальніца, там сапраўды атрымліваеш неверагоднае задавальненне ад сваёй дзейнасці.

У Быхаве малады ўрач працуе на прыёме пацыентаў. Расказвае, што вядзе яго з 8 гадзін раніцы да 16.00. Людзей звяртаецца шмат. Яно і не дзіўна: сёння хваробы неўралагічнага паходжання адны з самых распаўсюджаных. Перапынак на абед невялікі, расслабляцца няма калі. Закінуў бутэрброд у рот, запіў кавай — і зноў вяртаешся да пацыентаў.

— Сёння шмат хто скардзіцца на болі ў спіне, — ацэньвае стан здароўя быхаўчан урач. — І тут важна паставіць правільны дыягназ. Ацаніць, дзе боль лакалізаваны. Гэта мышачны спазм ці нешта больш сур'ёзнае.

На прыём прыходзяць у асноўным людзі сталыя і сярэдняга ўзросту. Любяць спытацца, ці надоўга да іх маладая ўрач прыехала. Час пакажа. Пакуль яна і горад толкам не бачыла. У першыя дні работы з непрывычкі нават не паспявала ўкласціся ў часовыя рамкі, крыху затрымлівалася пасля работы. Трэба было ва ўсё ўнікнуць, разабрацца, плюс картачку запоўніць, рэцэпт выпісаць. Але ўжо прызвычаілася. Тым больш што спяшацца ёсць куды — ключы ад арэнднай кватэры ў доме непадалёк ад бальніцы яна атрымала за некалькі дзён да пачатку работы. Двухпакаёўку з вялікімі прасторнымі пакоямі, дзе літаральна перад заездам жыльцоў быў зроблены рамонт, яна дзеліць са сваёй калегай з Гомеля. Лічыць, што такое вырашэнне кватэрнага пытання вялікі плюс для маладога спецыяліста, і ўдзячна дзяржаве, якая праяўляе клопат пра такіх, як яна.

Цяпер дзяўчына абжываецца на новым месцы, бацькі дапамагаюць наводзіць утульнасць. Трэба было набыць мэблю, з густам яе расставіць. Аліна прыхільніца мінімалізму і прастаты ў абыходжанні: адмовілася ад груваcткай шафы і аддала перавагу адкрытым скрыначкам і палічкам. Айчым замацаваў іх там, дзе трэба. Атрымалася ўтульна і ўсё на віду — нічога не трэба шукаць.

Паглядзець, як маладая ўрач уладкавалася на новым месцы пражывання, ужо прыходзіла з бальніцы спецыяліст па кадрах. Цікавілася, ці ўсё задавальняе, чаго не хапае. Галоўны ўрач бальніцы Таццяна Саніна наогул апякае маладых супрацоўнікаў. Аліна адразу ж звярнула ўвагу, што іх шмат у калектыве. Сёлета ў гэтую ж бальніцу, акрамя яе, размеркаваліся яшчэ чатыры дактары. Спадабалася,

### ❍ У тэму

### Галоўны ўрач Быхаўскай ЦРБ Таццяна САНІНА:

— Сёлета наш калектыў папоўніўся пяццю ўрачамі: неўролагам, афтальмолагам, анестэзіёлагам, хірургам, урачом агульнай практыкі. На сёння па ўрачах — вузкіх спецыялістах у нас пытанне закрыта. Вельмі рада, калі прыходзяць маладыя супрацоўнікі. Яны ініцыятыўныя, актыўныя, у іх запал у вачах, імкненне працаваць. Пра іх работу ад жыхароў ужо паступаюць станоўчыя водгукі. Кажуць, што ветлівыя, культурныя, уважлівыя. За ўсімі маладымі спецыялістамі замацаваны настаўнікі. Літаральна днямі мы збіралі іх, каб пазнаёміць паміж сабой, з настаўнікамі, калектывам, расказаць пра тое, хто за што адказвае, агучылі пытанні па зарплаце, жыллі, магчымасцях нашага прафсаюза. Больш маштабнае ўшанаванне маладых спецыялістаў у нас звычайна праходзіць у верасні, пасля таго, як яны крыху папрацуюць на новым месцы. Першае працоўнае месца — гэта заўсёды каласальны вопыт, разуменне, як дзейнічае сістэма аховы здароўя, пачынаючы з раённага ўзроўню. Нават калі яны потым і не застаюцца ў раёне, усё роўна яны больш дасведчаныя, чым іх калегі, якія пачынаюць у буйных гарадскіх медустановах. Бо ў іх будзе разуменне, як працуе сістэма пярвічнага звяна, якая абслугоўвае сельскага пацыента. Плюс яшчэ ў тым, што ў раённай бальніцы хутчэй можна зрабіць кар'еру. Тут хутчэй заўважаць лідарскія, арганізатарскія здольнасці. Я сама калісьці пачынала тут у якасці ўчастковага тэрапеўта. Сёння бальніца паляпшае сваю матэрыяльна-тэхнічную базу, праводзіцца капітальны рамонт двух асноўных лячэбных будынкаў. Купляецца новае абсталяванне, робіцца ўсё для таго, каб пацыенты не былі ні ў чым пакрыўджаны, а ў маладых спецыялістаў было жаданне застацца.

# Вітаем, маладое папаўненне!

## ПРАЦАВАЦЬ І ЖЫЦЬ КАМФОРТНА

Сёння ў вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі краіны задзейнічана 231 тысяча кіруючых супрацоўнікаў і спецыялістаў.

— Для параўнання, у 1990—1994 гадах мы атрымлівалі прадукцыі ў два разы менш, чым сёння. А працавалі ў той час у сельскай гаспадарцы 1 млн 90 тысяч работнікаў, — кажа **начальнік галоўнага ўпраўлення адукацыі, навукі і кадравай палітыкі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь Уладзімір САМСАНОВІЧ.** — Гэта сведчыць аб тым, што тэхналагічныя працэсы, распрацаваныя вучонымі, укаранёны ў сельскагаспадарчую вытворчасць. Ні адна навуковая распрацоўка не можа рэалізавацца самастойна, для гэтага патрэбны спецыялісты. І 90 працэнтаў моладзі, што сёння выпускаецца з аграрных устаноў адукацыі, занята менавіта ў сельскай гаспадарцы.

Адсылаючы свае наступныя словы перш за ўсё да моладзі, Уладзімір Самсановіч падкрэсліў, што работнікі АПК краіны заслугоўваюць усяго, што мы называем дастойным: умоў працы і побыту, заработнай платы, усяго неабходнага для паўнацэннага жыцця ў вёсцы.

— Кіраўніком дзяржавы ставіцца задача зрабіць усё, каб жыццё ў вёсцы было багацейшым, больш прыгожым, цікавым, каб маладыя людзі маглі рэалізаваць свае планы і намеры на зямлі, — сказаў прадстаўнік Мінсельгасхарча. — Таму дзяржава працуе над павышэннем прэстыжнасці пражывання ў сельскай мясцовасці: будуюцца новыя дамы гарадскога тыпу, школы, амбулаторыі, дзіцячыя садкі, крамы, аддзяленні сувязі, банкі і іншае. Набірае тэмпы праект «Вёска будучыні». Ужо сёння на карце Беларусі ёсць з дзясятак адрасоў, дзе ён здзейсніўся.

Мадэрнізацыя, новыя тэхналогіі як на вытворчасці, так і ў побыце — усё гэта робіцца не для птушачкі. А дзеля таго, каб маладыя і перспектыўныя маладыя спецыялісты выбралі месцам свайго жыцця і прафесійнага росту сельскую мясцовасць. Але аднаго жадання, каб так і было, мала.

— Сёння кожны кіраўнік павінен усвядоміць, што своечасовы падбор, правільная расстаноўка спецыялістаў, рацыянальнае выкарыстанне кадравага патэнцыялу, стварэнне ўмоў для замацавання кадраў — гэта яго доля, — адзначыў Уладзімір Самсановіч.

І дадаў, што жаданага ўзроўню замацоўвання моладзі ў арганізацыях АПК дасягнуць пакуль не ўдаецца. Але ёсць рух наперад, а значыць, ёсць і далягляды. Паводле яго слоў, сёння дзейнічае каля 17 нарматыўных прававых актаў, накіраваных на замацаванне маладых спецыялістаў у сельскагаспадарчых арганізацыях. Гэта і льготы, і забеспячэнне жыллём, і даплаты, а таксама тарыфныя пагадненні паміж Міністэрствам сельскай гаспадаркі, прафсаюзамі і Беларускім аграпрамысловым саюзам. Студэнтам вышэйшых аграрных устаноў адукацыі па іх жаданні з 2021 года даецца магчымасць у перыяд навучання ў ВНУ (на канікулах) прайсці воінскую службу ў рэзерве, што вызваляе іх ад тэрміновай службы. На сёння такую службу праходзяць 179 студэнтаў, 50 яе скончылі.

## СА ШКОЛЬНАЙ ЛАВЫ

Практыка паказвае, што найбольш паспяхова ў сельскагаспадарчых арганізацыях асвойваюцца маладыя спецыялісты — выхадцы з сельскай мясцовасці. І гэта зразумела: яны адаптаваны да вясковых умоў жыцця ў вёсцы і будучую спецыяльнасць выбіраюць свядома. Але ёсць і іншыя варыянты прывіць моладзі яшчэ са школьнай лавы цікавасць да розных сфер сельскай гаспадаркі.

— З 2018 года ў Беларусі функцыянуюць класы аграрнай накіраванасці, — дзеліцца Уладзімір Самсановіч. — Іх вучні па праграме факультатыўных заняткаў «Уводзіны ў аграрныя прафесіі» ў 10-11 класах вывучаюць свет сельскагаспадарчых раслін і жывёл, асновы аграрнай вытворчасці і тэхналогіі атрымання прадукцыі раслінаводства і жывёлагадоўлі, тэхнічнае і энергетычнае забеспячэнне сельскагаспадарчай галіны. — Гэта добрая магчымасць вызначыцца з выбарам будучай прафесіі, а гаспадаркам — адабраць прафесійна арыентаваных абітурыентаў, якія паступяць на профільныя спецыяльнасці ў аграрныя ВНУ на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі.

## КАЛЕДЖ — УДАЛЫ СТАРТ

Падрыхтоўку кадраў па спецыяльнасцях сярэдняй спецыяльнай адукацыі для галіны сельскай гаспадаркі ў 2024 годзе ў краіне ажыццяўляюць 37 устаноў адукацыі па 12 спецыяльнасцях. Набор складае каля 4 тысяч чалавек. Амаль у два разы больш такіх устаноў на ўзроўні прафесійна-тэхнічнай адукацыі — падрыхтоўка рабочых кадраў для арганізацый сельскай гаспадаркі ажыццяўляецца па 5 спецыяльнасцях і 14 кваліфікацыях у 64 каледжах. Штогадовы набор — каля 3 тысяч чалавек.

— Сістэма ПТА і ССА інтэгравана ў адзіны від установы адукацыі — каледж, — расказвае **начальнік упраўлення прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Аляксандра ПЯТРОВА.** — Сёння ў нас тры віды каледжаў. Сярод іх ёсць тыя, якія рэалізоўваюць праграмы толькі сярэдняй спецыяльнай адукацыі, пэўная частка — толькі праграмы прафесійна-тэхнічнай. А таксама каледжы, якія рэалізоўваюць праграмы і ПТА, і ССА. Усяго — 293 установы.

Прадстаўнік адукацыйнага ведамства расказала аб тым, што ва ўсіх каледжах, акрамя асноўнай дзейнасці, рэалізоўваюцца адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі дарослых, якія займаюцца прафесійнай падрыхтоўкай і перападрыхтоўкай, павышэннем кваліфікацыі рабочых і служачых, у тым ліку і для сістэмы АПК.

Аляксандра Пятрова таксама адзначыла, што ў Беларусі паспяхова функцыянуюць 52 цэнтры кампетэнцый у сістэме сярэдняй спецыяльнай адукацыі, якія аснашчаны найноўшым абсталяваннем і прызначаны забяспечыць асваенне перадавых метадаў

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*